# “Шталаг – 342” - незагойная рана майго горада

*Скарынка Марыя*, студэнтка групы 11201418, СФ
Кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт *Дз.М. Хромчанка*

Мінулае не праходзіць бясследна. Архіўныя дакументы, сведчанні ваеннапалонных і мірных грамадзян бясспрэчна пацвярджаюць, што ў ліпені 1941 года ў горадзе Маладзечна з прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў створаны канцлагер – шталаг № 342, які дзейнічаў да ліпеня 1944 года. Гэта адзін з 15 самых вялікіх лагераў смерці, створаных нямецкімі акупантамі ў Беларусі.

А.І. Мазанік, былы франтавік, які доўгі час займаўся пошукам сведкаў і даследваннем падзей, звязаных з маладзечанскім канцлагерам, прыйшоў да высновы, што шталаг № 342 быў таксама адным з самых страшных па жорскасці абыходжання з вязнямі сярод канцлагераў, створаных фашыстамі на беларускай зямлі.

Напрыклад, былы ваеннапалонны П. Г. Краснапёркін расказваў наступнае: “Ужо ў жніўні 1941 года былі першыя выпадкі смерці ад голаду. З ваеннапалонных была створана каманда магільшчыкаў, якая займалася пахаваннем памёршых. Спачатку іх хавалі ў адзенні, а затым голымі. У гэтым жа годзе наступіла ранняя зіма з першымі моцнымі марозамі. Баракі, дзе размяшчаліся ваеннапалонныя, не ацяпляліся, лазні не было. Пачаўся тыф. Людзі замярзалі днём і ў час сну ноччу. Смяротнасць дайшла да 350-400 чалавек у суткі. Немцы ніякіх мер не прымалі..”

Р.Я. Шыраеў знаходзіўся ў шталагу № 342 са жніўня 1941 да восені 1942 гг. Вось яго успаміны: “За час майго знаходжання ў лагеры я быў сведкам прыкладна пяці выпадкаў, калі немцы ўнутры лагера стралялі з аўтаматаў па ваеннапалонных. Былі выпадкі расстрэлу людзей на рабоце і ў час канваіравання з работы”.

Пазней, у красавіку 1945года, надзвычайная камісія правяла абследванне 221 месца пахавання ваеннапалонных. На 73 магілах на той час захаваліся надпісы на крыжах адносна колькасці пахаваных. На іх аснове камісія ўстанавіла, што ў іх пахавана 16 930 чалавек, што складае ў сярэднім на адну магілу 150 чалавек. Для пацверджання правільнасці надпісаў на крыжах адносна колькасці пахаваных камісіяй адна з магіл, з подпісам “16 чалавек” была раскрыта і ў ёй сапраўды былі астанкі 16 чалавек. На падставе

знойдзенных магіл, а таксама паказанняў сведкаў устаноўлена, што ўсяго закатаваных у канцлагеры № 342 – 33 150 чалавек.

У канцлагеры паміраў партызан Мікалай Цімафеевіч Шэшмянёў. З дапамогай патрыёта з вескі Лебедзева Маладзечанскага раёна яго вывезлі са шталага. Мікалай Цімафеевіч успамінае: "В Молодечненском шталаге очутились тысячи людей из Смоленской, Орловской, Брянской облстей… Они были здесь за колючей проволокой, в переполненных бараках, где задыхались от тесноты, духоты и нечистот. Даже более-менее здоровым людям было тяжело выдержать такие условия. А что говорить о больных и слабых, стариках и детях. Могилы в лагере росли на глазах. Не меньше страданий приносило постоянное недоедание, чувство голода. И тут нельзя не вспомнить местных жителей. Молодечненцы постоянно приносили нам продукты. Связано это было всегда с риском. Фашисты запрещали всякие контакты с пленными. А потом, как косой, людей начал косить тиф. Мне с помощью Алексея Бобрика из Лебедева, который привозил в лагерь продукты, удалось вырваться из шталага. …Из всего пережитого запомнились сострадание и человечность, помощь и открытость души белорусов, жителей Молодечненщины, которая стала для меня второй Родиной".

Заслуга А.І. Мазаніка ў захаванні памяці аб загінуўшых незлічоная. Менавіта яго ініцыятывай і намаганнямі пры падтрымцы арганізацый і ведамстваў горада Маладзечна, Мінскай вобласці і рэспублікі ў 1995 г. на месцы былога шталага па вуліцы Замкавай быў узведзены мемарыяльны комплекс. Над праектам мемарыяла "Шталаг-342" працаваў вядомы беларускі архітэктар Леанід Левін, адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу "Хатынь".

У кожнага народа свая памяць, але ёсць даты, агульныя для ўсіх. Адна з іх – 11 красавіка – Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. Менавіта ў гэты дзень каля мемарыяла "Шталаг-342" кожны год праходзіць мітынг-рэквіем.

За кожным імем загінулых вязняў, увекавечаных у мемарыяльным комплексе, – сямейная трагедыя, слёзы і боль. І памяць, якая перадаецца ад аднаго пакалення да другога, павінна заставацца ў нашых думках назаўжды і трэба зрабіць усё, для таго, каб кашмарны лёс Маладзечанскага шталага ніколі не паўтарыўся.